Лудзек Навара → Яўген Афнагель

Шаноўны Яўген!

Я вельмі ўважліва сачыў і сачу за высілкамі тысяч беларусаў, якія патрабуюць свабоды, на якую маюць права. Недзе сярод гэтых гісторый адвагі знаходзіцца і Ваша гісторыя, якая заслугоўвае захаплення і падтрымкі.

Перад Вашай адвагай я схіляю галаву. Тыя гісторыі, за якімі мы цяпер назіраем на ўсходзе Еўропы, мне асаблівым чынам блізкія. Бо яны падобныя да тых, якія я добра ведаю з былой Чэхаславакіі. Як журналіст і сцэнарыст я ўжо шэраг гадоў імкнуся фіксаваць падзеі трэцяга супраціву ў Чэхаславакіі. То-бок супраціву наступу чырвонага таталітарызму пасля камуністычнага путчу 1948 года. Той супраціў, на першы погляд, мог здавацца непаспяховым. Яго ўдзельнікі апынуліся ў турме або ў эміграцыі, а камуністычны рэжым пры падтрымцы Масквы ўмацаваў свае пазіцыі. У канцы шасцідзясятых гадоў здавалася, што сітуацыя мяняецца, але прыехалі савецкія танкі... Выглядала, што тыя, хто паўсталі супраць прыгнёту, стараліся дарэмна і праз цэнзуру ды фальсіфікацыю гісторыі назаўжды застануцца забытыя.

Цяпер мы ведаем, што ўсё наадварот. Забытыя будуць тыя, хто стаялі на баку зла, а перадусім мы бачым, што ўвесь той перыяд цемры не быў страчаны, што з'явіўся цэлы шэраг адважных асобаў, цудоўных людзей, што ўзніклі гісторыі, якімі мы цяпер можам ганарыцца. Выявілася, што чэхі і славакі біліся, што яны не аддалі сваю свабоду танна і паказалі прыклады на будучыню. Бо свабода дзе заўгода і калі заўгодна можа апынуцца пад пагрозай. Тыя, хто яе хочуць захапіць, мелі б ведаць, што за гэта прыйдзе расплата. Урэшце таталітарны рэжым паў, дзякуючы ўсім тым, хто супраціўляўся яму ад пачатку, хто стаяў на правільным баку і ўтрымаў ідэалы свабоды. З іх бярэ сілу і сучасная грамадзянская супольнасць.

І хоць часам можа здавацца, што мэта далёка, змаганне за павагу да правоў і свабодаў мае сэнс. Гэта пасланне, якое я расчытаў з соцень гісторый тых, якія паўсталі супраць камуністычнага таталітарызму ў Чэхаславакіі. Рызыкавалі сваёй пасадай, здароўем, уласнай свабодай, а часам і жыццём, каб супраціўляцца злу. Уласна, гэта і Ваша гісторыя. Але гэтыя гісторыі, вядома, не зусім аднолькавыя, у цяперашні час межы свабоднай Еўропы пасунуліся да самых межаў Беларусі, еўрапейцы старанна сочаць за тым, што адбываецца на ўсходзе, а таму ідэалы свабоды маюць большую сілу, чым у часе, калі праз сярэдзіну Еўропы праходзіла жалезная заслона.

Таму я веру, што прынцыповай будзе розніца ў часе. Што несвабодны рэжым у Вашай краіне падзе ўжо неўзабаве, а значыць, важней за ўсё вытрымаць. Зычу Вам найперш веры і сілы, каб Вы маглі вытрымаць.

Лудзек Навара

## Лудзек Навара (нар. 1964)

чэшскі публіцыст, пісьменнік нон-фікшн, гісторык і сцэнарыст.



Лудзек Навара спачатку скончыў будаўнічы факультэт у брненскай палітэхніцы, а пазней завочна філасофскі факультэт Універсітэта Масарыка па спецыяльнасці “гісторыя”. З 1995 года працаваў рэдактарам у газеце “Mladá fronta Dnes”. У цяперашні час супрацоўнічае галоўным чынам з інтэрнэт-парталам Aktuálně.cz і чэшскім тэлебачаннем. У галіне гісторыі і публіцыстыкі скіроўвае сваю ўвагу найперш на злачынствы таталітарных рэжымаў або высяленне судэцкіх немцаў. Ён аўтар кніг “Смерць называе сябе Тутэр” (2002), “Нацысцкі забойца на службе дзяржбяспекі” (2002) і трох тамоў “Гісторый жалезнай заслоны” (2004, 2006, 2007), па матывах якіх быў створаны аднайменны тэлевізійны серыял. Да 30-гадовага юбілею падзення камуністычнага рэжыму ў 2019 годзе выйшлі “Гісторыі жалезнай заслоны” ў новым, выпраўленым і дапоўненым, выданні.

Лудзек Навара цесна супрацоўнічае з пісьменнікам Міраславам Касачакам, з якім у 2009 годзе заснаваў грамадскае аб’яднанне “Памяць”, якое дакументуе камуністычны таталітарызм у Чэхаславакіі, асабліва ў рэгіёне Паўднёвай Маравіі. Разам з Касачакам яны напісалі некалькі кніг, прысвечаных трэцяму супраціву і камуністычным рэпрэсіям 50-х гг., сярод якіх “Млынары з Бабіц” (2008), “Гісторыі трэцяга супраціву” (2010) ці “Чапліныя сеткі” (2012). Дзякуючы гэтаму інтэнсійнаму супрацоўніцтву ўзніклі біяграфіі “На ўцёках. Неверагодная гісторыя Ёзэфа Брыкса” (2014) і “Я буду блізка: Жыццё і пакутніцкая смерць ксяндзоў Яна Булы і Вацлава Дрболы з Бабіц” (2016). Пакуль апошняй працай гэтай аўтарскай двойцы стала біяграфія “Трэба адважна ісці наперад: Трагічны лёс змагара Пэтра Кршыўкі” (2019).

Лудзек Навара – лаўрэат журналісцкай прэміі імя Карла Гаўлічака Бораўскага (2007), прэмія Антаніна Швэглы (2010), а разам з Міраславам Касачакам – медаля св. Кірыла і Мяфодзія (2016) і Памятнага медаля Чэшскай біскупскай канферэнцыі (2018).

# Лудзек Навара → Яўген Афнагель



## Яўген Афнагель

актывіст, які з маладых гадоў удзельнічае ў палітычных арганізацыях (Малады Фронт, Зубр і інш.). З часам стаў адным з галоўных арганізатараў вулічных акцый і пратэстаў, за што супраць яго неаднойчы чыніліся правакацыі і фабрыкаваліся абвінавачанні, служкі рэжыму неаднойчы збівалі яго і адпраўлялі на суткі. Цяпер Афнагель – адзін з лідараў “Еўрапейскай Беларусі”. Быў арыштаваны 25 верасня і абвінавачаны ва ўдзеле ў масавых беспарадках.